## 8 красавіка 2024 г. – 75 гадоў з дня нараджэння Ігара Васільевіча Соўпеля (1949), вучонага ў галіне тэхнічнай кібернетыкі і інфарматыкі, доктара тэхнічных навук, прафесара



Ігар Васільевіч Соўпель нарадзіўся 8 красавіка 1949 года ў вёсцы Гарадзец Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Выпуснік Гарадзецкай сярэдняй школы (1966).

У 1971 годзе скончыў матэматычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна па спецыяльнасці «Матэматыка».

Працаваў у Інстытуце матэматыкі Акадэміі навук БССР. У 1976-1978 гадах - аспірант кафедры матэматычнага забеспячэння аўтаматычнай сістэмы кіравання (АСК) БДУ.

Кандыдат фізіка-матэматычных навук (1980). З 1981 года І. В. Соўпель -дацэнт кафедры МЗ АСК. У снежні 1991 года абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Автоматизированная переработка текста на основе воспроизводящего моделирования лингвистических объектов и процессов». З 1992 года – прафесар кафедры МЗ АСК. Вучонае званне прафесара прысвоена ў 1994 годзе.

У 1997 годзе І. В. Соўпель абраны на пасаду загадчыка кафедры матэматычнага забеспячэння АСК факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ. З'яўляецца навуковым кіраўніком лабараторыі інтэлектуальных інфармацыйных сістэм. Ім сфармулявана і развіта канцэпцыя новага навуковага напрамку ў галіне штучнага інтэлекту – узнаўленчага мадэліравання лінгвістычных аб'ектаў і працэсаў. Яго навуковыя і прыкладныя інтарэсы цесна звязаны з праектаваннем, распрацоўкай і ўкараненнем сістэм аўтаматычнай апрацоўкі тэкстаў, уключаючы сістэмы лінгвістычных баз ведаў, семантычнага аналізу тэкстаў, аўтаматычнага рэферыравання, машыннага перакладу, інтэлектуальных інтэрфейсаў карыстальніка, інжынерыі ведаў, інтэлектуалізацыі інфармацыйных сістэм.

І. В. Соўпель з'яўляецца аўтарам шэрагу вынаходніцтваў у галіне штучнага інтэлекту, якія запатэнтаваны ў

міжнародных патэнтных фондах. Пад яго кіраўніцтвам распрацаваны такія знакамітыя ў сучаснай інфарматыцы інтэлектуальныя інфармацыйныя сістэмы, як Cobrain, Knowledgist, Vedy, Goldfive Intelligence, а таксама шэраг сістэм у межах важнейшых рэспубліканскіх навукова-тэхнічных праграм, якія забяспечваюць і развіваюць камп’ютарную форму існавання беларускай мовы.

Ігар Васільевіч чытае для студэнтаў ФПМІ агульныя курсы: «Автоматизированные системы управления», «Модели и методы искусственного интеллекта», «Интеллектуальные информационные системы». Стварыў камп’ютарную сістэму беларуска-рускага і руска-беларускага машыннага перакладу тэкстаў. З'яўляецца адным са стваральнікаў праграмы для праверкі работ на плагіят, якая была распрацавана ў 2014 годзе.

На працягу шэрагу гадоў Ігар Васільевіч працаваў на пасадзе намесніка дэкана па навуцы ФПМІ, з'яўляецца членам Навукова-метадычнага савета Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, вучоным сакратаром Савета па абароне доктарскіх дысертацый у БДУ, членам рэдакцыйнага савета часопіса «Веснік БДУ».

У 1999 годзе ўзнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь».

Матэрыял падрыхтаваны ў 2019, дапоўнены ў 2024 г.
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі

## Працы

**Совпель, Игорь Васильевич**. Автоматизированная переработка текста на основе воспроизводящего моделирования лингвистических объектов и процессов : диссертация … доктора технических наук : 05.25.05 : защищена 25.12.1991 : утверждена 24.01.1992 / И. В. Совпель. — Минск, 1991.

**Совпель, Игорь Васильевич**. Автоматизированная переработка текста на основе воспроизводящего моделирования лингвистических объектов и процессов : автореферат диссертации … доктора технических наук : 05.25.05 / Совпель И. В. – Харьков, 1991. – 35 с.

**Совпель, Игорь Васильевич**. Вопросы реализации систем автоматического анализа текстов естественных языков : автореферат диссертации ... кандидата физико-математических наук : 01.01.10 / И. В. Совпель. – Киев : Институт кибернетики, 1980. – 15 с.

**Совпель, И. В.** Автоматизация обработки текста / И. В. Совпель. – Минск : БГУ, 2016.

**Совпель, И. В.** Автоматизированная система ведения словарей и карточек АСВС / И. В. Совпель // Математические обеспечение ЕС ЭВМ. - Минск, 1979.

**Совпель, И. В.** Инженерно-лингвистические принципы, методы и алгоритмы автоматической переработки текста / И. В. Совпель. – Минск : Вышэйшая школа, 1991. – 116 с. : ил.

**Совпель, И. В.** Информационно-поисковая система пословно-оборотного перевода текстов / И. В. Совпель // Математическое обеспечение ЕС ЭВМ. - Минск, 1981.

**Совпель, И. В.** Математика для поступающих в БГУ и не только… : [пособие] / И. В. Совпель. – Минск : НП «Информбанк», 1990. – 83 с.

**Sovpel, I. V.** Development and application of corpus of a virtual texts in MM-system / I. V. Sovpel // Вестник БГУ. Серия 1, Физика. Математика. Информатика. — Минск, 1996. — № 3. — С. 74—79.

**Голяк, Ю. Д.** Автоматическое дополнение русскоязычных пользовательских запросов на основе подсказок типа «глагольная группа», «грамматическая основа предолжения» и «лексикон» / Голяк Ю. Д., Совпель И. В. // Вестник МГЛУ. Серия 1. Филология. - 2021. - № 4. - С. 84–93.

**Рубашко, Н. К**. Компьютерный фонд белорусского языка и перспективы создания белорусского лингвистического портала / Н. К. Рубашко, Г. П. Невмержицкая, И. В. Совпель // Слово и словарь : сборник научных трудов по лексикографии. - Гродно, 2007. - С. 44–46.

### *Аб жыцці і дзейнасці І. В. Соўпеля*

**Соўпель Ігар Васільевіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2002. – Т. 15. – С. 91.

**Совпель Игорь Васильевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 2. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 279.

**Совпель Игорь Васильевич** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2008. – Т. 7. - С. 16–17.

**Совпель Игорь Васильевич** // Прафесары і дактары навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, 1921-2001 : 80 год. - Мінск, 2001. - С. 260.

**Соўпель Ігар Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 442.

**Вядомыя** землякі. **Соўпель Ігар Васільевіч** // Гарадзец – маленькі горад : інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік да 880-годдзя з часу першага згадвання ў гістарычных крыніцах в. Гарадзец Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2022. – С. 38 : фат. – (Серыя «Па вёсках нашага краю»).

**Соўпель Ігар Васільевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. - Кобрын, 2020. - С. 145-146 : фат.

**75 гадоў з дня нараджэння І. В. Соўпеля (1949)** // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. – С. 132.

**Курачук, С.** Люди белорусской науки – наши земляки / Светлана Курачук // Кобрынскі веснік. – 2024. – 27 студзеня (№ 4). - С. 14 : фот.

**Курачук, С.** Імёны на карце Кобрыншчыны / Святлана Курачук // Кобрынскі веснік. – 2017. – 11 лістапада. – С. 3.

Да Сусветнага дня навукі было прымяркавана выданне супрацоўнікамі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі біябібліяграфічнага даведніка «Людзі навукі нашага краю» з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны».

**Курачук, С.** Кобринское слово сказано и в науке / Светлана Курачук // Кобрин-информ. - 2017. - 20 июля. - С. 5.

Центральная районная библиотека ГУК «Кобринская районная централизованная библиотечная система» начинает работу над очередным проектом «Славутыя імёны Кобрыншчыны», первый этап которого – база данных «Людзі навукі нашага краю».

**Курачук, С.** Людзі навукі нашага краю / Святлана Курачук // Кобрынскі веснік. - 2017. - 5 красавіка. - С. 3.

**Курачук, С.** Портреты интеллекта. Учёные Кобринщины : Знакомьтесь - биобиблиографический справочник об ученых нашего края / Светлана Курачук // Кобрин-информ. - 2017. - 9 ноября. - С. 33.

Ко Всемирному Дню науки было приурочено издание библиографами Кобринской центральной районной библиотеки биобиблиографического справочника «Людзі навукі нашага краю» из серии «Імёны на карце Кобрыншчыны».

**Костюкевич, А.** В БГУ используют собственную программу для проверки работ на плагиат / Антон Костюкевич // СБ. Беларусь сегодня. - 2014. - 19 сентября (№179).

Одним из создателей «чудодейственной таблетки от лени для студентов» стал профессор кафедры информационных систем управления, доктор технических наук Игорь Совпель.

Кобрынскі раён
Гарадзец
Соўпель Ігар Васільевіч
Вучоныя
Матэматыкі
Прафесары